ISSN 2076-4839

*«Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія»*

Заснавальнік – установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы».

Часопіс зарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне № 118 ад 24.03.2009.

Навуковы часопіс
Выдаецца з сакавіка 2009 года, выходзіць адзін раз у чатыры месяцы.

**“Vesnik Hrodzenskaha Dziarzhaunaha Universiteta Imia Ianki Kupaly. Seryia 1. Historyia i Arkhealohiia. Filasofiia. Palitalohiia”**

*Часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, а таксама ўваходзіць у навукаметрычную базу дадзеных «Расійскі індэкс навуковага цытавання»*

Часопіс асвятляе пытанні айчыннай гісторыі, усеагульнай гісторыі, археалогіі, этналогіі, гістарыяграфіі, крыніцазнаўства; анталогіі, гнасеалогіі, аксіялогіі, філасофскай антрапалогіі, сацыяльнай філасофіі, філасофіі культуры, глабалістыкі, прагностыкі; гісторыі палітычнай думкі, параўнальнай паліталогіі, палітычнага кіравання, грамадзянскай палітыкі, палітычнай ідэалогіі, палітычнай псіхалогіі, палітычнай культуры, парталогіі, палітычнай эліталогіі, палітычнай канфліктвалогіі, палітычнай рэгіяналістыкі, палітычнай камунікацыі і інш. Публікуюцца таксама рэцэнзіі, артыкулы, прысвечаныя выдатным беларускім вучоным, хроніка навуковага жыцця ГрДУ імя Янкі Купалы, іншыя матэрыялы.

Артыкулы друкуюцца на беларускай, рускай, польскай, англійскай і нямецкай мовах.

Разлічаны на спецыялістаў і шырокае кола чытачоў.

**Нашы падпісныя індэксы: для індывідуальных падпісчыкаў – 00466, для арганізацый – 004662.**

Адрас рэдакцыі: вул. Ажэшкі, 22,
230023, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь.
Тэл./факс: 8(0152) 73-19-10.

Адрас для карэспандэнцыі: вул. Тэлеграфная, 5,
230023, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь.
Тэл.: 8(0152) 68-11-96, +375 33 6893315,
e-mail: vesnik@grsu.by

*Адрас вэб-сайта:* http://vesnik.grsu.by

Рэдактар: А. Б. Лешанюк. Карэктар: Т. В. Комар.
Падрыхтоўка арыгінал-макета: Н. С. Шаршаневіч.

Падпісана да друку 11.09.2023. Фармат 70 × 108 1/16. Папера афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 15,40. Ул.-выд. арк. 18,70. Тыраж 100 экз. Заказ 041.

Надрукавана на тэхніцы выдавецкага цэнтра
ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы».
ЛП № 02330/146.
Б-р Ленінскага Камсамола, 5, 230009, г. Гродна. Тэл.: 8(0152) 55-67-69, e-mail: pko_izdat@grsu.by

**Том 15, № 3, 2023**

© Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», 2023

Галоўны рэдактар – **Ірына Фёдараўна Кітурка,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Гродна, Беларусь)

Намеснік галоўнага рэдактара – **Аляксандр Аляксандравіч Маскевіч,** доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, старшыня рэдакцыйнага савета (Гродна, Беларусь)

**Міжнародны рэдакцыйны савет:**
**Бумблаўскас Альфрэдас,** доктар гістарычных навук, прафесар (Вільнюс, Літва)
**Гжыбоўскі Ежы,** доктар хабілітаваны, прафесар (Варшава, Польшча)
**Зелянкоў Анатоль Ізотавіч,** доктар філасофскіх навук, прафесар,
намеснік старшыні міжнароднага рэдакцыйнага савета (Мінск, Беларусь)
**Карасімяёнаў Георгій,** доктар філасофскіх навук, прафесар (Сафія, Балгарыя)
**Круглашоў Анатоль Мікалаевіч,** доктар палітычных навук, прафесар (Чарнаўцы, Украіна)
**Крыштаповіч Леў Яўстаф'евіч,** доктар філасофскіх навук, прафесар (Мінск, Беларусь)
**Ліпскі Барыс Іванавіч,** доктар філасофскіх навук, прафесар (Санкт-Пецярбург, Расія)
**Пунчанка Алег Пятровіч,** доктар філасофскіх навук, прафесар (Адэса, Украіна)
**Пятрухін Уладзімір Якаўлевіч,** доктар гістарычных навук, прафесар (Масква, Расія)
**Радзікаў Іван Уладзіміравіч,** доктар палітычных навук, прафесар,
намеснік старшыні міжнароднага рэдакцыйнага савета (Санкт-Пецярбург, Расія)
**Раманаў Алег Аляксандравіч,** доктар філасофскіх навук, прафесар (Наваполацк, Беларусь)
**Сляшыньскі Войцех,** доктар хабілітаваны, прафесар (Беласток, Польшча)
**Смолік Аляксандр Іванавіч,** доктар культуралогіі, прафесар (Мінск, Беларусь)
**Стрэльчанка Васіль Іванавіч,** доктар філасофскіх навук, прафесар (Санкт-Пецярбург, Расія)
**Шырынянц Аляксандр Андрэевіч,** доктар палітычных навук, прафесар (Масква, Расія)

Адказны сакратар рэдакцыі – **Наталля Сяргееўна Шаршаневіч**, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт (Гродна, Беларусь).
Тэл.: 8(0152) 68-11-96, +375 33 6893315, e-mail: vesnik@grsu.by

**Рэдакцыйная калегія:**
**Ватыль Віктар Мікалаевіч,** доктар палітычных навук, прафесар, адказны рэдактар (Гродна, Беларусь)
**Піваварчык Сяргей Аркадзьевіч,** доктар гістарычных навук, дацэнт,
намеснік адказнага рэдактара па навуковым напрамку «Гісторыя і археалогія» (Гродна, Беларусь)
**Кірвель Чэслаў Станіслававіч,** доктар філасофскіх навук, прафесар,
намеснік адказнага рэдактара па навуковым напрамку «Філасофія» (Гродна, Беларусь)
**Антановіч Ніна Арсеньеўна,** доктар палітычных навук, прафесар (Мінск, Беларусь)
**Бусько Іна Уладзіміраўна,** кандыдат філасофскіх навук, дацэнт (Гродна, Беларусь)
**Вабішчэвіч Аляксандр Мікалаевіч,** доктар гістарычных навук, прафесар (Брэст, Беларусь)
**Вадап'янаў Павел Аляксандравіч,** доктар філасофскіх навук, прафесар (Мінск, Беларусь)
**Землякоў Леанід Яўгенавіч,** доктар палітычных навук, прафесар (Мінск, Беларусь)
**Карпінскі Віктар Войціхавіч,** кандыдат філасофскіх навук, дацэнт (Гродна, Беларусь)
**Кікель Павел Васільевіч,** доктар філасофскіх навук, прафесар (Мінск, Беларусь)
**Кошалеў Уладзімір Сяргеевіч,** доктар гістарычных навук, прафесар (Мінск, Беларусь)
**Лапа Вольга Уладзіміраўна,** кандыдат палітычных навук (Гродна, Беларусь)
**Малевіч Юліяна Ігараўна,** доктар палітычных навук, дацэнт (Мінск, Беларусь)
**Марозава Святлана Валянцінаўна,** доктар гістарычных навук, прафесар (Гродна, Беларусь)
**Мельнік Уладзімір Андрэевіч,** доктар палітычных навук, прафесар (Мінск, Беларусь)
**Нечухрын Аляксандр Мікалаевіч,** доктар гістарычных навук, прафесар (Гродна, Беларусь)
**Новік Яўген Канстанцінавіч,** доктар гістарычных навук, прафесар (Мінск, Беларусь)
**Пазнякоў Валерый Уладзіміравіч,** доктар філасофскіх навук, прафесар (Мінск, Беларусь)
**Рашэтнікаў Сяргей Васільевіч,** доктар палітычных навук, прафесар (Мінск, Беларусь)
**Семярнік Сняжана Здзіславаўна,** кандыдат філасофскіх навук, дацэнт (Гродна, Беларусь)
**Цыганкова Ларыса Іванаўна,** кандыдат філасофскіх навук, дацэнт (Гродна, Беларусь)
**Чарапіца Валерый Мікалаевіч,** кандыдат гістарычных навук, прафесар (Гродна, Беларусь)
**Ярмусік Эдмунд Станіслававіч,** доктар гістарычных навук, прафесар (Гродна, Беларусь)

***Нашы партнёры:***
**Дзяржаўная акадэмія славянскай культуры** (Расія); **Інстытут археалогіі і этналогіі ПАН у Варшаве** (Польшча); **Інстытут усеагульнай гісторыі РАН** (Расія); **Інстытут славяназнаўства РАН** (Расія); **Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава** (Расія); **Нацыянальны педагагічны ўніверсітэт імя М. П. Драгаманава** (Украіна); **Падляская акадэмія ў Седльцах** (Польшча); **Падляскі музей** (Польшча); **Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт** (Расія); **Універсітэт у Беластоку** (Польшча); **Ягелонскі ўніверсітэт у Кракаве** (Польшча).

# Змест

**Гісторыя і археалогія**

***Беларуская дыяспара ў XX ст.: персанальныя і калектыўныя стратэгіі***

***Горный А. С. (Гродно, Беларусь).*** Вступительное слово ....6

***Антошин А. В. (Екатеринбург, Россия).*** «Он умер с уверенностью в победе сил свободы и демократии над коричневой гитлеровской чумой»: белорусские трудовые иммигранты в Канаде в 1945 г. ....8

***Мосейкина М. Н. (Москва, Россия).*** Судьба репатриантов: П. П. Шостаковский и его семья в Беларуси ....17

***Горны А. С. (Гродна, Беларусь).*** Інтэлектуальныя цэнтры беларускай дыяспары ў міжваенны перыяд ....28

***Запарий Ю. В., Бородунина К. В. (Екатеринбург, Россия).*** Миссия Администрации помощи и восстановления Объединенных Наций (ЮНРРА) в Белоруссии (по материалам Секции управления архивами и документацией ООН) ....36

***Ананька К. Д. (Гродна, Беларусь).*** Сацыяльная адаптацыя беларускіх эмігрантаў у амерыканскім грамадстве ў першай чвэрці XX ст. ....47

***Чарняўскі А. Г. (Гродна, Беларусь).*** Выдавецкая дзейнасць беларускай нацыянальнай меншасці ў міжваеннай Латвіі (1918–1940 гг.) ....58

***Айчынная гісторыя***

***Касяноўская Г. С. (Гродна, Беларусь).*** Арганізацыя і дзейнасць службы пажарнай аховы ў мястэчках Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. ....75

***Макоўская Я. У. (Мінск, Беларусь).*** Узнікненне першых вотчынных мануфактур на тэрыторыі Беларусі ў XVIII ст.: гістарыяграфія пытання ....82

***Археалогія, этналогія, спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны***

***Піваварчык С. А., Гаршкоў А. Д. (Гродна, Беларусь).*** Археалагічныя даследаванні Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы ў XXI стагоддзі ....89

**Філасофія**

***Філасофская антрапалогія***

***Миськевич В. И. (Минск, Беларусь).*** Ценностно-смысловые аспекты постнеклассического антропологического проекта ....97

***Глабалістыка***

***Петрушак В. Л. (Гродно, Беларусь).*** Смена центров цивилизационной интеграции на территории геоцивилизационного макрорегиона «Восток» ....109

**Паліталогія**

***Палітычнае кіраванне***

***Маркевич А. И. (Минск, Беларусь).*** Государственная пограничная политика Республики Беларусь: этапы, характеристика механизма реализации, место в общем пространстве безопасности Союзного государства ....119

***Палітычная рэгіяналістыка***

***Есин Р. О., Чжао Янь (Минск, Беларусь).*** Общественные блага в контексте белорусско-китайского межрегионального сотрудничества ....128

***Турунцев П. В. (Минск, Беларусь).*** Политические аспекты евразийской интеграции на современном этапе ....136

***Юсупов П. В. (Минск, Беларусь).*** Институты коммуникации органов государственной власти и бизнес-сообщества в Республике Армения ....146

***Палітычная камунікацыя***

***Капалыгина И. И., Лапа О. В. (Гродно, Беларусь).*** Концептуальные основы информационного пространства: социально-политический дискурс ....155

***Палітычная глабалістыка***

***Яо Цзэни (Минск, Беларусь).*** Влияние территориальных споров в Южно-Китайском море на трансформацию морской политики КНР ....165

Аннотации депонированных в ГрГУ им. Янки Купалы работ ....172

УДК 94(476)

**А. С. Горны**

# ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫЯ ЦЭНТРЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

Во введении автор статьи обозначил актуальность изучения интеллектуальной истории белорусской диаспоры в межвоенный период, обращая внимание на ее связь с культурными процессами в Западной Беларуси и БССР. При этом нельзя отрицать определенные особенности и специфические черты интеллектуального дискурса эмигрантов, которые ранее не были предметом комплексного исследования. Многие теоретические аспекты этой проблемы требуют нового осмысления с использованием современных методологических подходов, в том числе вопрос выделения интеллектуальных центров межвоенной белорусской эмиграции. В основной части статьи выделены авторские критерии для определения интеллектуальных центров: наличие периодического издания, участие белорусских эмигрантов в интеллектуальном дискурсе тех стран, где они проживали, влияние эмигрантов на культурные процессы в метрополии. На основе данных критериев определены два интеллектуальных центра, которые находились в Ковно (совр. Каунас) и Праге. Первый центр во многом состоял из редакций «толстых» журналов «Беларускі сцяг» и «Крывіч». Второй центр включал в себя интеллектуальный потенциал белорусской политической эмиграции и студентов, которые обучались в пражских высших учебных заведениях. Оба этих центра стали основой для формирования трех направлений общественно-политической мысли белорусской межвоенной эмиграции. В соответствии с авторской классификацией этими направлениями были просоветское, независимое и «кривичское». Каждое из них по-своему выстраивало модель существования в будущем белорусской государственности и предлагало конкретные пути национального строительства и сохранения национальной идентичности. В заключении показаны причины, которые не позволили сформировать интеллектуальные центры в других местах проживания белорусских эмигрантов, а также подчеркнут высокий уровень развития эмигрантской интеллектуальной мысли, позволивший создать подобные площадки в Ковно и Праге.

***Ключевые слова:*** межвоенный период, белорусская диаспора, интеллектуальные центры, Чехословакия, Литва, общественно-политическая мысль.

**Уводзіны.** Значным фактарам існавання беларускай эміграцыі ў міжваенны перыяд быў яе культурны і інтэлектуальны патэнцыял. Працуючы ў розных палітычных умовах, дзеячы беларускай дыяспары мелі магчымасць генерырваць новыя ідэі, удзельнічаць у дыскусіях па пытаннях палітыкі, гісторыі і культуры Беларусі, распрацоўваць уласныя навуковыя і палітычныя канцэпцыі і распаўсюджваць іх у асяроддзі не толькі эмігрантаў, але і інтэлектуалаў з мітраполіі. Інтэлектуальны дыскурс беларускай эміграцыі ў міжваенны перыяд з’яўляўся складовай часткай агульнабеларускай культурнай прасторы, але, у адрозненні ад культурнага жыцця Заходняй Беларусі і БССР, быў даследаваны гісторыкамі не дастаткова поўна і глыбока, без выкарыстання міждысцыплійнага падыходу. Больш таго, некаторыя даследчыкі разглядалі гэты аспект гісторыі беларускай дыяспары як выключна самастойную асобную з’яву, мала звязаную з інтэлектуальнымі працэсамі на уласна беларускіх землях. На нашу думку, такі падыход з’яўляецца памылковым, а культурна-інтэлектуальныя пошукі беларускіх эмігрантаў трэба разглядаць у непасрэднай сувязі з элементамі культурнага і інтэлектуальнага жыцця Заходняй Беларусі і БССР. Пры гэтым нельга адмаўляць, што інтэлектуальная думка беларускай дыяспары мела свае пэўныя асаблівасці і спецыфічныя ўласцівасці.

Інтэлектуальная гісторыя беларускай дыяспары ў міжваенны перыяд не была аб’ектам спецыяльнага даследавання, аднак у некаторых аспектах разглядалася ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. У працах У. Ляхоўскага, В. Коваль, А. Бучы і Т. Блашчака былі зроблены спробы прасачыць асноўныя здабыткі дзейнасці беларускіх эмігрантаў у накірунку культурнага

***Горны Аляксандр Сяргеевіч,*** канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, кіраўнік Цэнтра даследаванняў дыяспар і замежнага беларусазнаўства ГрДУ імя Янкі Купалы (Беларусь).

***Адрас для карэспандэнцыі:*** вул. Кастрычніцкая, 5, 230023, г. Гродна, Беларусь; e-mail: litvin.gorny@gmail.com

*© «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», 2023*

pawet.net

развіцця, пашырэння і захавання ведаў аб Беларусі ва ўмовах знаходжання ў розных краінах [1–4]. У той жа час тэарэчычныя аспекты праблемы інтэлектуальнай гісторыі, вызначэнне асноўных накірункаў грамадскай думкі беларускіх эмігрантаў і іх інтэлектуальных цэнтраў увогуле не былі адлюстраваны ў гістарычных даследаваннях, што стварае падставы для новага асэнсавання гэтага накірунка гісторыі беларускай дыяспары.

**Асноўная частка.** Сярэдзіна 1920-х гг. была складаным перыядам у гісторыі беларускай палітычнай эміграцыі ў Еўропе. Як вядома, у кастрычніку 1925 г. на Берлінскай канферэнцыі ўрад БНР, які разглядаўся многімі эмігрантамі у якасці «звяна, што яднае беларускую эміграцыю з бацькаўшчынай», самаліквідаваўся, а яго найбольш актыўныя члены рыхтаваліся да выезду ў савецкую Беларусь. Назіраўся глыбокі палітычны крызіс беларускага замежжа, прыкладам якога былі шматлікія расколы, узаемныя канфлікты, адсутнасць сталых сувязяў з заходняй і ўсходняй часткамі Беларусі [5, с. 156]. Разам з тым у гэты перыяд былі сфарміраваны значныя інтэлектуальныя цэнтры, якія прэтэндавалі на ролю палітычнага і інтэлектуальнага лідара не толькі для эміграцыйнага асяроддзя, але і для ўсёй беларускамоўнай культурнай і палітычнай прасторы.

Неабходна вылучыць шэраг крытэрыяў, паводле якіх мы вызначаем той ці іншы эміграцыйны асяродак як інтэлектуальны цэнтр. На нашу думку, такімі крытэрыямі могуць выступаць наступныя з'явы:

1. Наяўнасць перыядычнага інтэлектуальнага выдання (выданняў), альбо так званага «тоўстага» часопіса, на старонках якога абмяркоўваліся не толькі пытанні гісторыі, палітыкі, але друкаваліся літаратурныя творы, пераклады, агляды культурнага жыцця ў БССР і Заходняй Беларусі, кніжныя рэцэнзіі.

2. Актыўны ўдзел беларускіх эмігрантаў у інтэлектуальных дыскурсах тых краін, дзе яны пражывалі, іх супрацоўніцтва з рознымі адукацыйнымі і навуковымі інстытутамі.

3. Распаўсюджванне ідэй і канцэпцый беларускіх эмігрантаў пэўнага інтэлектуальнага цэнтра ў культурным дыскурсе Заходняй Беларусі, БССР і сярод беларускай меншасці ў Латвіі ў міжваенны перыяд.

Аналізуючы культурнае жыццё беларускай дыяспары ў міжваенны перыяд згодна з вызначынымі крытэрыямі, можна вызначыць два інтэлектуальных цэнтра беларусаў замежжа, якія канчаткова сфарміраваліся ў 1920-я гг. – Літва (Коўна) і Чэхаславакія (Прага). У першым выпадку генератарам новых ідэй выступала рэдакцыя часопіса «Крывіч» на чале з В. Ластоўскім у Коўна, у другім выпадку значную культурна-асветніцкую дзейнасць праводзіла пражская група беларускіх эсэраў на чале з Т. Грыбам, П. Крэчэўскім і інш. Трэба адзначыць, што абодва гэтыя асяродкі мелі сталую ўзаемасувязь паміж сабой.

Інтэлектуальны цэнтр у Коўна пачаў фарміравацца ў пачатку 1920-х гг., калі ў гэтым горадзе намаганнямі А. Цвікевіча ў красавіку 1922 г. было арганізавана выданне часопіса «Беларускі сцяг». Дадзены часопіс на той час з'яўляўся адзіным «тоўстым» часопісам у беларускамоўнай культурнай прасторы, на старонках якога абмяркоўвалася шырокае кола пытанняў: літаратура, гісторыя, мастацтва, палітыка, агляд прэсы, рэцэнзіі і інш. [6]. Вядомы часопіс «Полымя» пачаў выдавацца ў Мінску ў снежні 1922 г., ужо пасля выхаду ў свет ковенскага часопіса. Аднак з-за фінансавых прычынаў выйшла ўсяго 4 нумары «Беларускага сцягу», і ў верасні 1922 г. яго выданне прыпынілася. Як сцвярджае гісторык Т. Блашчык, дадзены часопіс увайшоў у гісторыю беларускай літаратуры тым, што на яго старонках была надрукавана першая вядомая ў беларускай літаратуры спроба гістарычнай аповесці – твор В. Ластоўскага «Мікалай Галубовіч» [4, с. 226].

У 1923 г. у Коўна пачаў выходзіць новы літаратурны і грамадска-палітычны часопіс «Крывіч». Выдаўцамі і рэдактарамі выдання выступалі К. Дуж-Душэўскі і В. Ластоўскі, аднак менавіта апошні дзеяч аказваў значны ўплыў на рэдакцыйную палітыку часопіса. На яго старонках друкаваліся літаратурныя творы беларускіх аўтараў, пераклады замежнай літаратуры, гістарычныя і этнаграфічныя нарысы, палітычныя артыкулы, рэцэнзіі і агляды нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў у Заходняй Беларусі, БССР і за мяжой. Усяго выйшла 12 нумароў часопіса, апошні нумар быў выдадзены ў 1927 г., пасля чаго выданне «Крывіча» прыпынілася, а сам В. Ластоўскі пераехаў у БССР [7, с. 145].

Аналіз матэрыялаў часопіса «Крывіч» дазваляе сцвярджаць, што гэта выданне ў сярэдзіне 1920-х гг. пераўтварыла Коўна ў сапраўдны цэнтр беларускага інтэлектуальнага жыцця. З дапамогай часопіса В. Ластоўскі пашыраў у беларускамоўнай інтэлектуальнай прасторы сваю «крыўскую тэорыю» паходжання беларусаў. Вялікае месца ў часопісе займалі пераклады на беларускую мову твораў англійскай, літоўскай, польскай, эстонскай, фінскай, японскай і індыйскай літаратур, уласная літаратурная творчасць беларускіх аўтараў В. Ластоўскага, А. Ружанцова, А. Матача і інш. Сярод іншых на старонках «Крывіча» друкаваліся палітычныя памфлеты, аўтары якіх спрабавалі прааналізаваць злабадзённыя праблемы развіцця беларускага нацыянальнага руху ў эміграцыі і мітраполіі, асэнсаваць складаныя праблемы «расколаў» у беларускім грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі і г.д. [8].

Дзякуючы даследаванню дакументаў з рэдакцыйнага архіву часопіса «Крывіч» (Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы), можна прыйсці да высновы, што ковенскі інтэлектуальны цэнтр аказваў пэўны уплыў на навуковы гуманітарны дыскурс у Заходняй Беларусі, БССР, у іншых асяродках беларускай дыяспары. Як ужо падкрэслівалася вышэй, сталыя сувязі рэдакцыі «Крывіча» былі з беларускімі дзеячамі ў Чэхаславакіі. У рэдакцыйнай пошце часопіса адкладаліся лісты пражскіх беларусаў Т. Грыба, І. Дварчаніна, М. Ільяшэвіча, Я. Ляцкага з уласным аўтарскім аналізам некаторых матэрыялаў і артыкулаў, што друкаваліся ў выданні [9, арк. 1–1 адв., 3, 9–15]. Дастаткова значны ўплыў часопіс аказваў на культурныя пошукі беларускай дыяспары ў Латвіі, напрыклад, такія дзеячы, як К. Езавітаў, А. Сальцэвіч, выступалі адкрытымі прыхільнікамі «крыўскай тэорыі» В. Ластоўскага [10, арк. 1–5]. Даследаванні часопіса «Крывіч» абмяркоўваліся таксама ў межах гуманітарных дыскурсаў у Савецкім Саюзе, дзе актыўнымі чытачамі і аўтарамі выдання былі мінскі гісторык А. Шлюбскі і даследчык з Пярмі А. Савіч [11, арк. 8–9; 12, арк. 15–18 адв.]. Абодва мелі сталую перапіску з Ластоўскім па пытаннях гісторыі і этнаграфіі. Некаторыя артыкулы часопіса актывізавалі ў савецкай Беларусі вывучэнне шэрага аспектаў гісторыі кнігадрукавання і этнаграфіі.

Часопіс «Крывіч» меў сваё распаўсюджванне і ў Заходняй Беларусі, калі тагачасная Польшча знаходзілася фактычна ў стане вайны з Літвой. З гэтай прычыны часопіс у дадзенай краіне меў статус паўлегальнага выдання і мог быць канфіскаваны польскай паліцыяй за антыдзяржаўны змест. Напрыклад, у верасні 1924 г. пад часператрусу ў маладых беларускіх актывістаў з в. Гаркавічы Сакольскага павета былі знойдзены некалькі нумароў «Крывіча», якія зацікавілі мясцовую паліцыю [13, арк. 230]. Рэдакцыя часопіса пільна адсочвала тыя палітычныя працэсы, што адбываліся ў Заходняй Беларусі, змяшчаючы адпаведную хроніку і аналітыку на старонках выдання. У рэдакцыйную пошту прыходзілі матэрыялы, якія не маглі быць надрукаваны ў Заходняй Беларусі з-за польскай цэнзуры. У прыватнасці, у рэдакцыю часопіса трапілі вершы і іншыя рукапісы В. Маслоўскай-Мурашка, якая з 1923 г. знаходзілася ў Беластоцкай турме па справе беларускага эсэраўскага партызанскага руху [14, арк. 77–102].

Другім інтэлектуальным цэнтрам беларускай эміграцыі ў міжваенны перыяд была Чэхаславакія, а дакладна – горад Прага. Фарміраванне беларускай дыяспары ў Чэхаславакі стала магчымым дзякуючы правядзенню чэхаславацкім урадам з лета 1921 г. праграмы па падтрымцы эміграцыі з былой Расійскай імперыі («Руская акцыя»). Асновай гэтай праграмы была падрыхтоўка ў ВНУ Чэхаславакіі эмігранцкай моладзі, якая ў будучым, па меркаванні прэзідэнта ЧСР Т. Г. Масарыка, павінна была адыграць ключавую ролю ў адраджэнні дэмакратычнайі прыхільнай да Чэхаславакіі Расіі. Беларускія арганізацыі скарысталі «Рускую акцыю» для вырашэння іншай задачы, а менавіта для падрыхтоўкі кадраў інтэлігенцыі для Заходняй Беларусі і Латгаліі [15, с. 3]. Неабходна заўважыць, што характэрнай рысай інтэлектуальнага жыцця беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі стала перадача пэўнага вопыту, ідэй і канцэпцый ад старога пакалення беларускіх дзеячоў да моладзі, якая пасля знаходжання ў чэхаславацкім беларускім асяроддзі працягвала сваю дзейнасць у метраполіі, у прыватнасці ў Заходняй Беларусі.

У міжваенай Празе дзейнічалі ўсе вышэй згаданыя крытэрыі, паводле якіх гэты горад можна лічыць інтэлектуальным цэнтрам беларускай эміграцыі ў міжваенны перыяд. У прыватнасці, чэшскія беларусы выдавалі каля 7 часопісаў, сярод якіх трэба вызначыць часопісы «Перавясла», «Замежная Беларусь», «Іскры Скарыны» [15, с. 4]. Гэтыя выданні друкавалі розны спектр інтэлектуальных матэрыялаў – ад палітычных фельетонаў да кніжных рэцэнзій. Многія прадстаўнікі беларускай дыяспары актыўна ўключаліся ў еўрапейскі дыскурс наконт Беларусі, знаёмілі еўрапейскую навуку з дасягненямі беларускай культуры і навукі, пацвярджэннем чаго з'яўляецца значная колькасць рэцэнзій і артыкулаў у чэшскіх і іншых славяназнаўчых часопісах. Існавалі сталыя кантакты беларускага асяроддзя ў Чэхаславакіі з навуковымі і культурнымі цэнтрамі ў БССР, Заходняй Беларусі і Прыбалтыцы.

У пералічаных вышэй інтэлектуальных цэнтрах у міжваенны перыяд былі сфарміраваны пэўныя накірункі грамадска-палітычнай думкі, якія адлюстроўвалі інтэлектуальныя пошукі эмігранцкіх дзеячаў і іх спробы знайсці адказы на важныя грамадскія пытанні. У дадзенай публікацыі мы вылучаем тры такія накірункі: прасавецкі, незалежніцкі і «крыўскі». Прааналізуем кожны з іх асобна.

1. Прасавецкі накірунак – падтрымка прыхільнага стаўлення да палітыкі беларусізацыі і савецкай Беларусі ў асяроддзі беларускіх эмігрантаў. Асабліва моцна быў пашыраны ў 1920-я гг. сярод беларусаў-эмігрантаў у Чэхаславакіі і ў асяроддзі беларускай меншасці ў Латвіі і Літве. У Празе пачынаючы з восені 1921 г. сярод прадстаўнікоў дыяспары актыўную камуністычную прапаганду праводзілі марксісты П. Цветкаў і Я. Бабровіч, якія з'яўляліся сябрамі Беларускай грамады. Паступова разуменне Мінска як цэнтра па аб'яднанні беларускіх зямель усё больш пашыралася сярод пражскіх беларусаў. Гэтаму спрыялі поспехі нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР (палітыка беларусізацыі, узбуйненні БССР) [16, с. 456]. У 1925 г. у Празе быў створаны Саюз студэнтаў-грамадзян БССР, які праводзіў актыўную саветафільскую агітацыю ў эмігранцкім асяродку. З Саюзам супрацоўнічаў, прынамсі, беларускі пісьменнік У. Жылка. На арганізацыйным сходзе Саюза студэнтаў-грамадзян БССР, на якім прысутнічалі 27 чалавек, была агучана галоўная мэта арганізацыі – «дапамога маладым людзям пасля сканчэння вучобы праз прадстаўніцтва СССР атрымаць савецкае грамадзянства і дазвол на ўезд у БССР» [16, с. 460].

У Латвіі на саветафільскіх пазіцыях знаходзілася частка мясцовага беларускага актыву, якая была набліжана да групы незалежных сацыялістаў на чале з К. Езавітавым. Пазітыўны вобраз савецкай Беларусі і яе палітыкі ствараўся на старонках рыжскай беларускай газеты «Голас беларуса», аднаднёўкі «Праца» і г.д. Разам з тым, як адзначае гісторык Ю. Грыбоўскі, прасавецкія погляды, напрыклад, газеты «Голас беларуса» не былі рэдкасцю ў асяроддзі беларускай інтэлігенцыі ў 1920-я гг. і не толькі ў Латвіі. З'яўляліся яны часткай значна шырэйшых працэсаў, якія тады адбываліся, адлюстроўвалі ўсю складанасць і вастрыню праблемаў, з якімі сутыкнуўся беларускі нацыянальны рух ў першай палове XX ст. [17, с. 221].

2. Незалежніцкі накірунак – прадстаўнікі гэтага накірунка грамадскай думкі беларускай эміграцыі выступалі за аб'яднанне ўсіх беларускіх земляў у незалежную дзяржаву па прыкладу заходнееўрапейскіх дэмакратый (Т. Грыб, П. Крэчэўскі, В. Захарка, К. Дуж-Душэўскі, А. Матач). Падобныя ідэі актыўна абмяркоўваліся на старонках такіх выданняў, як «Бюлетэнь загранічнай групы БПСР», «Беларускі сцяг», «Іскры Скарыны», на старонках рускамоўнай, літоўскамоўнай, чэшскамоўнай перыёдыкаў. Таксама некаторыя беларускія эмігранты прапаноўвалі праекты будучага існавання беларускай дзяржавы, у тым ліку ў межах розных інтэграцыйных праектаў. У гэтым рэчышчы дастаткова цікавымі з'яўляюцца погляды Т. Грыба і яго канцэпцыя будучыні беларускай дзяржаўнасці. Як бачна з яго эпісталярыяў, палітык у некаторай ступені прытрымліваўся канцэпцыі «перараджэння бальшавізму» ў СССР, якая была дастаткова распаўсюджана ў асяроддзі рускай сацыялістычнай эміграцыі ў 1920-я гг. Лідар беларускіх эсэраў быў упэўнены, што савецкая палітычная сістэма перыяду нэпу знаходзіцца ў глыбокім крызісе, адной з істотных прычын якога з'яўляецца непрыяцце насельніцтвам і інтэлігенцыяй камуністычных установак. Палітычны крызіс, на думку Т. Грыба, непазбежна прывядзе камуністаў да дыялогу з іншымі палітычнымі сіламі і стане падставай для лібералізацыі

савецкага рэжыму. У адным са сваіх лістоў да В. Ластоўскага ён пазначаў: «У Маскве ідзе гутарка аб легалізацыі сацыялістычных партый. Магчыма што ў незабаве наша партыя зможа легальна працаваць і ў Радавай Беларусі, як і у заходняй» [18, с. 36]. У іншым лісце Грыб больш выразна акрэсліў сваю пазіцыю: «Усё роўна праз нейкі час (як хутка гэта станецца, залежыць ад розных прычын) бальшавікі змушаны будуць капітуляваць. Легалізацыя сацыялістычных партый стаіць у парадку дня. Пытаньне толькі часу. Мы да гэтага часу павінны правесьці салідную падгатоўку сваіх сілаў» [18, с. 36]. Аднак падобныя ацэнкі палітыка грунтаваліся на дастаткова завышаным уяўленні аб палітычнай і нацыянальнай актыўнасці розных пластоў грамадства ў БССР.

У чэшскім эміграцкім асяроддзі Т. Грыб актыўна абмяркоўваў тэму стварэння Сацыялістычнай лігі Новага Усходу, арганізацыі, якая, па меркаванні беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх эсэраў, павінна была займацца каардынацыяй «вырашэння нацыянальнага пытання ва Усходняй Еўропе». У лістах да В. Ластоўскага лідар беларускіх эсэраў прыводзіў аргументы на карысць стварэння так званай «Антанты Усходняй Еўропы», у склад якой увайшлі б створаныя пасля падзення савецкай улады незалежныя дзяржавы (Расія, Украіна, Беларусь, Грузія, Арменія і інш.), а таксама Польшча, Чэхаславакія, Югаславія, Балгарыя, Румынія [18, с. 36].

3. «Крыўскі» накірунак, або так званая «крыўская тэорыя», была шчыльна звязана з пошукам новай ідэнтычнасці ў гістарычным мінулым, прадугледжвала замену назвы «Беларусь» як негістарычнай на назву «Крыўя» і этноніма «беларусы» на этнонім «крывічы» (В. Ластоўскі, Я. Станкевіч, Т. Грыб) [19, с. 56, 57]. Тэарэтычныя асновы гэтага напрамку былі распрацаваны В. Ластоўскім у пачатку 1920-х гг. У артыкулах «Што спрыяе разросту і ўпадку народаў і дзяржаў», «Аб назовах “Крывія” і “Беларусь”», «Крыўская» інтрыга» (для літоўскай газеты «Lietuva»), прадмове да «Падручнага Расійска-Крыўскага Слоўніка» Ластоўскі прапанаваў ужываць этнонім «крывічы» пры абазначэнні ўсяго беларускага этнасу. Назвы «Беларусь», «беларускі» ён лічыў негістарычнымі. Канцэпцыя Ластоўскага, якая вызначалася значным нацыянальным фундаменталізмам, адразу набыла сваіх прыхільнікаў у эміграцыйным асяроддзі. Яе паслядоўнікі з’явіліся ў беларускім студэнцкім асяроддзі ў Чэхаславакіі, сярод часткі беларускай інтэлегенцыі ў Латвіі і Літве (А. Сальцэвіч, А. Ружанцоў і інш.). Дадзеная тэорыя актыўна распаўсюджвалася дзякуючы часопісу «Крывіч» і іншым працам Ластоўскага. Яна абмяркоўвалася ў гуманітарным дыскурсе нават БССР, дзе яе прыхільнікамі выступалі гісторыкі А. Шлюбскі, М. Мялешка і інш.

**Заключэнне.** Акрамя Коўна і Прагі ў міжваенны перыяд існавала магчымасць афармлення інтэлектуальных цэнтраў беларускай эміграцыі ў іншых краінах. У прыватнасці, з 1919 г. у межах Надзвычайнай дыпламатычнай місіі БНР пачаў фарміравацца дастаткова важны цэнтр беларускай эміграцыі ў Берліне. Аднак пасля ад’езду многіх беларускіх культурных і палітычных дзеячоў у іншыя краіны знік рэсурсны патэнцыял гэтага асяроддзя, што стала прычынай несфарміраванасці ў гэтым горадзе інтэлектуальнага цэнтру. Значнае культурнае жыццё і інтэлектуальныя дыскурсы адбываліся сярод беларускай меншасці ў міжваеннай Латвіі, аднак дзейнасць беларускіх інтэлектуалаў у гэтым рэгіёне была скіравана не столькі на «знешнюю» беларускую прастору, колькі на патрэбнасці выключна беларусаў у Латвіі. Акрамя іншага, у міжваенны перыяд у некаторых краінах пачалося фарміраванне значнага беларускага інтэлектуальнага асяродку, аднак завяршаючы этап гэтага працэсу прыпаў ужо на пасляваенны перыяд. У гэтым плане маюцца на ўвазе беларускія дыяспары ў Францыі і ЗША.

Фарміраванне цэнтраў інтэлектуальнага жыцця беларускай эміграцыі ў міжваенны перыяд засведчыла спеласць грамадскага дыскурса гэтай часткі беларускага культурнага поля. Ва ўмовах адарванасці ад асноўных інтэлектуальных цэнтраў, якія знаходзіліся ў падзеленай рыжскай мяжой метраполіі, беларускія эмігранты без асаблівай падтрымкі знешніх актораў здолелі арганізаваць сапраўдныя культурныя пляцоўкі, якія падтрымлівалі нацыянальную ідэнтычнасць ва ўмовах «чужога» асяроддзя. Больш таго, гэтыя пляцоўкі працавалі не толькі на ўнутранага спажыўца, але і аказвалі пэўны ўплыў на культурныя і палітычныя працэсы ў Заходняй Беларусі ці БССР, што дазваляе разглядаць іх у неразрыўнай сувязі з гэтымі тэрыторыямі.

## *СПІС ЛІТАРАТУРЫ*

1. *Ляхоўскі, У.* Грамадска-культурная чыннасць беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў 1921–1938 гг. / У. Ляхоўскі // Ёсць на карце месца… Грамадска-культурная чыннасць беларускай і расійскай эміграцыі ў Чэхаславакіі, 1921–1938 : каталог выставы / укл. Т. Р. Воранава. – Мінск : НАРБ, 2002. – С. 21–31.
2. *Коваль, В. У.* Культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх эмігрантаў з тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / В. У. Коваль // Назаўжды разам : да 80-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР : зб. навук. арт. / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т гісторыі; рэдкал.: А. А. Каваленя (старш.) [і інш.] – Мінск : Беларус. навука, 2021. – С. 78–83.
3. *Буча, А.* Беларускі навуковы кабінет у Празе (1927–1930 гг.): стварэнне і дзейнасць / А. Буча // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – № 4. – С. 11–18.
4. *Блашчак, Т.* Беларусы ў Літоўскай Рэспубліцы (1918–1940) / Т. Блашчак. – Смаленск : Інбелкульт, 2022. – 392 с.
5. *Ладысеў, У. Ф.* Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. – Мінск : БДУ, 2003. – 307 с.
6. Ад рэдакцыі // Беларускі сцяг. – 1922. – № 1. – С. 1–2.
7. *Казлоўскі, М.* Да кніжных скарбаў дакрануся…: нататкі бібліяфіла / М. Казлоўскі. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2011. – 384 с.
8. *Рэутт А.* Пара ачышчаць атмасфэру / А. Рэутт // Крывіч. – 1926. – Т. 11. – С. 101–104.
9. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). – F. 368. Ap. 1. B. 34.
10. LCVA. – F. 368. Ap. 1. B. 36.
11. LCVA. – F. 368. Ap. 1. B. 30.
12. LCVA. – F. 368. Ap. 1. B. 32.
13. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 43. Воп. 1. Спр. 23.
14. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 56.
15. *Буча, А. І.* Беларуская дыяспара ў Чэхаславакіі (1921–1938) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.03 / А. І. Буча. – Мінск, 2012. – 24 с.
16. *Буча, А.*Дзейнасць беларускіх прасавецкіх арганізацый у Чэхаславакіі ў 1920-я гады / А. Буча // Przegląd Środkowo-Wschodni. – 2019. – Т. 4. – С. 449–478.
17. *Гжыбоўскі, Е.* Савецкая рэчаіснасць на бачынах беларускай газеты ў Латвіі «Голас беларуса» (1925–1929 гг.) / Е. Гжыбоўскі // «Światła masz tyle w sobie…». Ze studiów wschodniosłowiańskich / red.: M. Kaczmarczyk [i inni]. – Lublin : Katolicki Uniwersytet Lubelski, 2015. – S. 207–222.
18. *Горны, А.* Эпісталярная спадчына Тамаша Грыба: новыя знаходкі / А. Горны, А. Буча // Беларускі гістарычны часопіс. – 2017. – № 11. – С. 34–47.
19. *Корбут, В.* «Мы – ратаі святла, крывічы»: тры вякі крыўскай ідэі / В. Корбут // Druvis. – 2005. – № 1. – С. 53–77.


Паступіў у рэдакцыю 21.08.2023.

“Vesnik of Yanka Kupala State University of Grodno. Series 1. History and Archaeology. Philosophy. Political Science”
Vol. 15, No. 3, 2023, pp. 28–34
© Yanka Kupala State University of Grodno, 2023

## Intellectual centers of the Belarusian diaspora in the interwar period

**A. S. Gorny**

*Yanka Kupala State University of Grodno (Belarus)*
Oktiabrskaya St., 5, 230023, Hrodna, Belarus; e-mail: litvin.gorny@gmail.com

**Abstract.** In the introduction, the author of the article outlined the relevance of studying the intellectual history of the Belarusian diaspora in the interwar period. He drew attention to the connection of the diaspora with the cultural processes in Western Belarus and the Belarussian SSR. It is also impossible to deny certain features and specific features of the intellectual discourse of emigrants, which have not previously been the subject of a comprehensive study. Many theoretical aspects of this problem require revision using modern methodological approaches, including the issue of identifying intellectual centers of the interwar Belarusian emigration. In the main part of the article, it is shown the author's criteria for determining intellectual centers: the presence of a periodical, the participation of Belarusian emigrants in the intellectual discourse of those countries where Belarusians lived, the influence of emigrants on cultural processes in the metropolis. Based on these criteria, two intellectual centers were identified, which were located in Kovno (present Kaunas) and Prague. The first center largely consisted of the editorial offices of the "thick" magazines "Belarusian Flag" and "Kryvich". The second center included the intellectual potential of the Belarusian political emigration and students who studied at Prague universities. Both of these centers became the basis for the formation of three areas of socio-political thought of the Belarusian

interwar emigration. The author proposes the following classification: pro-Soviet, independent and "Krivichs theory". Each of them, in its own way, built a model for the existence of the Belarusian statehood in the future and offered specific ways of nation building and preserving national identity. At the end of this article, the author shows the reasons that prevented the formation of intellectual centers in other places of residence of Belarusian emigrants. He points to the high level of development of emigrant intellectual thought, which made it possible to create similar sites in Kovno and Prague.

**Keywords:** interwar period, Belarusian diaspora, intellectual centers, Czechoslovakia, Lithuania, social and political thought.

## References

1. Liahovski U. Social and cultural activity of the Belarusian diaspora in Czechoslovakia in 1921-1938 [*Hramadska-kul'turnaia chynnasts' belaruskai dyiaspary u Chekhaslavakii u 1921-1938 hh.*]. There is a place on the map... Social and cultural status of Belarusian and Russian emigration in Czechoslovakia, 1921-1938 [*Ests' na kartse mestsa… Hramadska-kul'turnaia chynnasts' belaruskai i rasiiskai emihratsyi u Chekhaslavakii, 1921-1938 : kataloh vystavy*] ; ed. by T. R. Voranava. Minsk, 2002, pp. 21-31.

2. Koval' V. U. Cultural and educational activities of Belarusian emigrants from the territory of Western Belarus (1921-1939) [*Kul'turna-asvetnitskaia dzeinasts' belaruskikh emihrantau z terytoryi Zakhodniai Belarusi (1921-1939 hh.)*]. Forever together: to the 80th anniversary of the reunification of Western Belarus with the BSSR : col. of art. ; ed. by A. A. Kavalenia. Minsk, 2021, pp. 78-83.

3. Bucha A. Belarusian scientific cabinet in Prague (1927-1930): creation and activity [*Belaruski navukovy kabinet u Praze (1927-1930 hh.): stvarenne i dzeinasts'*]. *Belaruksi histarychny chasopis*, 2016, No. 4, pp. 11-18.

4. Blashchak T. Belarusians in the Republic of Lithuania (1918-1940) [*Belarusy u Litouskai Respublitsy (1918-1940)*]. Smalensk, 2022, 392 p.

5. Ladyseu U. F, Brygadzin P. I. Between East and West: the formation of statehood and territorial integrity of Belarus (1917-1939) [*Pamizh Uskhodam i Zakhadam: stanaulenne dziarzhaunastsi i terytaryial'nai tselasnastsi Belarusi (1917-1939 hh.)*]. Minsk, 2003, 307 p.

6. From the editors [*Ad redaktsyi*]. *Belaruski stsiah,* 1922, No. 1, pp. 1-2.

7. Kazlouski M. I will touch book treasures...: notes of a bibliophile [*Da knizhnykh skarbau dakranusia…: natatki bibliiafila*]. Minsk, 2011, 384 p.

8. Reutt A. Time to clear the atmosphere [*Para achyshchats' atmasferu*]. *Kryvich*, 1926, vol. 11, pp. 101-104.

9. Lithuanian Central State Archives (LCSA) [*Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA)*]. F. 368. L. 1. C. 34.

10. LCSA [LCVA]. F. 368. L. 1. C. 36.

11. LCSA [LCVA]. F. 368. L. 1. C. 30.

12. LCSA [LCVA]. F. 368. L. 1. C. 32.

13. State Archives of Grodno Region (SAGR) [*Dziarzhauny arkhiu Hrodzenskai voblastsi (DAHV)*]. F. 43. L. 1. C. 23.

14. Belarusian State Archive-Museum of Literature and Art (BSAMLA) [*Belaruski dziarzhauny arkhiu-muzei litaratury i mastatstva (BDAMLiM)*]. F. 3. L. 1. C. 56.

15. Bucha A. Belarusian diaspora in Czechoslovakia (1921-1938) [*Belaruskaia dyiaspara u Chekhaslavakii (1921-1938): autaref. dys. ... kand. hist. navuk*]. Minsk, 2012, 24 p.

16. Bucha A. Activities of Belarusian pro-Soviet organizations in Czechoslovakia in the 1920s [*Dzeinasts' belaruskikh prasavetskikh arhanizatsyi u Chekhaslavakii ÿ 1920-ia hady*]. *Przegląd Środkowo-Wschodni*, 2019, vol. 4, pp. 449-478.

17. Grzybowski E. Soviet reality on the pages of the Belarusian newspaper in Latvia "Holas belarusa" (1925-1929) [*Savetskaia rechaisnasts' na bachynakh belaruskai hazety u Latvii "Holas belarusa" (1925-1929 hh.)*]. "You have so much light in you…". From East Slavic studies [*"Światła masz tyle w sobie…". Ze studiów wschodniosłowiańskich*]. Lublin, 2015, pp. 207-222.

18. Gorny A., Bucha A. The Epistolary Legacy of Thomas Hryb: New Findings [*Epistaliarnaia spadchyna Tamasha Hryba: novyia znakhodki*]. *Belaruksi histarychny chasopis*, 2017, No. 11, pp. 34-47.

19. Korbut V. "We are plowmen of the light, Krivichi": three centuries of the Krivichi idea [*My - ratai sviatla, kryvichy": try viaki kryvichskai idei*]. *Druvis*, 2005, No. 1, pp. 53-77.



**Дзеці беларускіх эмігрантаў у карагодзе на адпачынку ў ваколіцах Чыкага. 1920-я гг. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва**



**Старшыня Місіі ЮНРРА ў Беларусі Рычард Скандрэт-малодшы і кіраўнік Упраўлення па забеспячэню ЮНРРА Канстанцін Ластоўскі аглядаюць гарод, засаджаны насеннем ЮНРРА. Віцебск, 1947 г. United Nations. Archives and records management section**

ISSN 2076-4839

Founder – Yanka Kupala State University of Grodno.

The journal is registered in the Ministry of Information of the Republic of Belarus in March 24, 2009.
The certificate of registration number 118.

The scientific journal
**“Vesnik Hrodzenskaha Dziarzhaunaha Universiteta Imia Ianki Kupaly.
Seryia 1. Historyia i Arkhealohiia. Filasofiia. Palitalohiia”**
is included into the List of scientific publications of the Republic of Belarus
for publishing the results of scientific research
and into the scientometrical database “Russian Science Citation Index”.

Published since March 2009, issued 3 times a year.

*“Vesnik of Yanka Kupala State University of Grodno.
Series 1. History and Archaeology. Philosophy. Political Science”*

The journal covers the problems of national history, world history, archaeology, ethnology, historiography, study of historical sources; ontology, gnosiology, axiology, philosophical anthropology, social philosophy, philosophy of culture, globalistics, prognostics; history of political thought, comparative political science, political government, civil politics, political ideology, political psychology, political culture, party studies, political elite studies, political conflicts studies, political regional studies, political communication, etc. Reviews, articles about famous Belarusian scientists, scientific life chronicle of the Yanka Kupala State University of Grodno are published.

Articles are published in Belarusian, Russian, Polish, English and German.

The journal is meant both for specialists and a wide circle of readers.

**Read and purchase our journal!**

**Our indices for subscription: for private subscribers – 00466, for institutions – 004662.**

Editorial office address: Ozheshko St., 22,
230023, Grodno, Belarus.
Tel./Fax: 8(0152) 73-19-10.

Address for correspondence: Telegrafnaya St., 5,
230023, Grodno, Belarus.
Tel.: 8(0152) 68-11-96, +375 33 6893315,
e-mail: vesnik@grsu.by

Website: http://vesnik.grsu.by

**Vol. 15, No. 3, 2023**

© Yanka Kupala State University of Grodno, 2023